# КОНЕГАДОЎЛЯ Ў АЛЬШЭВА



**стайні ў Альшэва (2023 год)**

На сённяшні момант у Беларусі ёсць свая толькі адна парода коней - беларуская запражная. Хоць парода афіцыйна і была зарэгістравана толькі ў 2000 годзе, але гісторыя яе з'яўлення мае доўгі шлях.

У XIX стагоддзі многія ўладальнікі маёнткаў займаліся конегадоўляй, вырошчвалі пародзістых коней, як для выездаў, так і для гаспадарчых прац. У 1850-х гадах налічвалася да 22 невялікіх прыватных конных заводаў і 4 дзяржаўныя завадскія стайні. Напрыканцы 1870-х гадоў вядомасцю карысталіся такія заводы як Горы-Гарэцкі, Мар'іна Горка, Вішнева, Гарадкі, Любань, Альшэва, Лябёдка, Крэва, Данюшава і іншыя: у іх утрымлівалася 170 племянных жарабцоў і больш за 1300 кабыл верхавых, запражных і цяжкавозных парод.

Вялікі ўплыў пад час фарміравання беларускай запражной пароды аказалі выбітныя жарабцы-вытворцы розных парод: гудбрансдальскай (Кастар, Тофтегуббен); шведскай (Алзінг, Лоў-Кадар, Міме), ардэнскай, брабансонскай, арлоўскай рысістай, якія пры скрыжаванні з абарыгеннымі маткамі ляснога тыпу да канца XIX стагоддзя стварылі новы тып запражных коней. Лепшыя прадстаўнікі конезаводаў экраніраваліся на розных выставах, якія ўжо з 1840-х гадах шырока праводзіліся ў Гродне, Вільні, Ашмянах, Лідзе, Смаргоні, Маладзечне, Карэлічах, Міры, Любчы, Навагрудку і іншых гарадах.

Усіх, хто трымае свой шлях да экасцежкі “Блакітныя азёры”, прыцягваюць позірк прыгожыя будынкі з чырвонай цэглы. Але не так шмат людзей ведае, што менавіта гэта месца згуляла адну з галоўных роляў у стварэнні беларускай пароды коней.Гісторыя конегадоўлі ў гаспадарчым комплексе Альшэва распачалася на пачатку XIX стагоддзя, калі ў 1830-я гады Станіслаў Хамінскі заснаваў адзін з самых старых конных заводаў Беларусі, дзе займаліся развядзеннем запражных коней розных парод. Спрыяла стварэнню конезавода выгаднае геаграфічнае становішча на вядучых транспартных трактах, якія злучалі Беларусь з Літвой, Польшчай і іншымі краінамі Еўропы, а таксама добрая кармавая база ў поймах рэк Віліі і Страчы.

У Альшэва на працягу шматгадовай селекцыйнай працы да пачатку XX стагоддзя сфарміраваўся свой асобны тып коней, на падставе якога Людвік, унук Станіслава

Хамінскага, распачынае сваю асаблівую селекцыйную працу, пад час якой атрымаліся коні, якія мелі сярэдні рост, крэпкую канстытуцыю і выдатную працоўную сілу. Вага жарабцоў дасягала 1200 кіль, а цяглавая моц дазваляла зрушыць з месца да 10-12 тон груза. Прадстаўнікоў асаблівай пароднай групы Людвік Хамінскі назваў “альшэўская запражная”.

У 1928-1930 гадах коні высока шанаваліся на рынку і экспартаваліся ў Германію, Аўстрыю, Літву, Польшчу; а на выставах у Варшаве і Любліне ў 1931-1939 гадах былі адзначаны залатымі медалямі.



Жер. Полонез, бул., 1968. Бел. упр. (68 Милчик - Птичка)
с-з “Константиново” Мядельский р-н.
Аттестат I ст. на ВДНХ СССР в 1971 г.,
Чемпион I Ошмянской выставки.

Калі ў 1940 годзе гаспадарка Хамінскіх была нацыяналізавана, на базе стайні арганізавалі Вілейскую дзяржаўную завадскую стайню, кантора якой размяшчалася ў сядзібным доме Хамінскіх. Да 1960 года на гэтай стайні было вырашчана больш за 30 000 племянных коней.

Шматгадовыя традыцыі Хамінскіх па вырошчванню коней працягнулі сапраўдныя прафесіяналы.



*Чыг.ст. Гудагай, Астравецкі р-н. Перад адпраўкай на Усесаюзныя спаборніцтвы. Справа другі - А. Шарашэўскі.*

У 1960 гады на Вілейскай дзяржаўнай стайні быў усталяваны ўсябеларускі рэкорд: калі на конефермах у тыя часы атрымоўвалі 60-70 жарабят на 100 конематак, то ў Альшэва Гатальскі Рыгор, тэхнік па штучнаму апладненню, атрымаў 100 жарабят ад 100 матак. У 1963 г. рэарганізаваная племянная станцыя была далучана да саўгаса «Канстанцінава».

На падставе патомкаў альшэўскай запражнай плённая селекцыйная праца дазволіла атрымаць выдатных прадстаўнікоў беларускай пароднай запражнай групы. Такія

выдатныя коні, як Цэзар, Дукат, Орлік, Запаветны, Паланэз, Лоўкі былі чэмпіёнамі або адзначаны атэстатам I ступені на ВДНГ СССР, усесаюзных спаборніцтвах і рэспубліканскіх выставах. Сын Орліка Норд у 1965 і 1967 годзе быў чэмпіёнам пароды.

Коневод-селекцыянер Шарашэўскі Аляксандр Эмануілавіч (31.01.1907 – 21.04.1987 - выпускнік Варшаўскага інстытута эканомікі па спецыяльнасці эканаміст-фінансіст. З 1947 года працаваў у Альшэва заатэхнікам, дзе пад яго кіраўніцтвам было выведзена больш за 600 элітных коней.



*Родапачынальнік лініі беларускай запрэжнай - ...эрабец Орлік.*

**Орлік перад сядзібным домам**



**Норд - чэмпіён пароды**

На Усесаюзным свяце конегадоўлі і конназаводства, прысвечаным 50-годдзю СССР, тройка беларускіх коней з саўгаса «Канстанцінава» Мядзельскага раёна пад кіраваннем майстра-наезніка Б. Б. Тэрэза была адной з лепшых. У Маскве дыпломы і каштоўныя падарункі спецыялістам гаспадаркі А.Э. Шарашэўскаму і Б.Б. Тэрэзу ўручаў асабіста Маршал Савецкага Саюза С. М. Будзёны.



*Тройка беларускіх запряжных пад кіраваннем Б.Тэрэза у час парада на Цэнтральным маскоўскім іпадроме*

За 20 гадоў імі было вырашчана больш за 600 племянных коней. Элітныя вытворцы гэтай гаспадаркі прадукавалі ў 36 гаспадарках 12 раёнаў Беларусі. Тут было выведзена 3 матачных сямейства: Майкі, Кветкі і Іскры.У 1971-1974 годзе на ферме мелася 147 коней, большая частка якіх выкарыстоўвалася ў гаспадарчых працах, коні славіліся сваім даўгалеццям і пладавітасцю. Ад кабыл атрымоўвалі малако для вытворчасці кумысу.



**Жарабец Лоўкі побач са стайнямі**

Але, не гледзячы на вялікаю племянную цэннасць, стайня не дажыла да нашых часоў. Дзесьці ў 1980-х гадах тут зніклі апошнія коні і больш чым 150-ці гадовая гісторыя конегадоўлі ў гэтых месцах была скончана.




Адно радуе, што шматгадовая праца таленавітых людзей не знікла ў небыцці, бо генатып коней гэтай гаспадаркі працягваецца ў шматлікіх нашчадках, якія жывуць не толькі ў розных кутках Беларусі, але і іншых краінах сусвету.